ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

ЛІСТАПАД–СНЕЖАНЬ

Віцебск 2016

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”
Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Лістапад–снежань

2016

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2017

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *Т. В. Пацалуёнак*
Рэдактар *Л. І. Рагачова*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : лістапад–снежань : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Т. В. Пацалуёнак]. – Віцебск, 2017. – 42 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2017

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Лістапад–снежань

2016

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Пацалуёнак** Таццяна Віктараўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: kray@vlib.by, vlib@vlib.by

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную па матэрыялах абласной газеты «Витебские вести», гарадскіх і раённых газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 лістапада па 31 снежня 2016 года, і ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтральнымі бібліятэкамі вобласці.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

7 лістапада адзначалася 99-я гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэтай гістарычнай падзеі былі прысвечаны шматлікія мерапрыемствы. 4 лістапада ў Канцэртнай зале «Віцебск» адбыліся ўрачысты сход і святочны канцэрт з удзелам народнага артыста Беларусі Мікалая Скорыкава. У Полацкім раённым Цэнтры культуры была афармлена выстава «Кастрычніцкая рэвалюцыя ў прадметах калекцыяніравання», прайшоў канцэрт з удзелам народнага хору ветэранаў Полацкага ГДК (кіраўнік З. Красненка) і іншых творчых калектываў і выканаўцаў горада. У Гарадоцкім ГДК быў арганізаваны канцэрт «Імперыя песні», у якім прагучалі песні мінулых гадоў у выкананні самадзейных калектываў і выканаўцаў. У фае экспанавалася выстава «1917 на Гарадоччыне», арганізаваная раённым краязнаўчым музеем. У навучальных установах Віцебшчыны праходзілі сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, піянерскага і камсамольскага руху. У бібліятэках былі арганізаваны інфармацыйныя гадзіны, гістарычныя віктарыны, лекцыі, кніжныя выставы. Гадавіне рэвалюцыі прысвячаліся шматлікія канцэрты ў клубных установах і шэраг спартыўных спаборніцтваў.

12 лістапада Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка наведаў з рабочым візітам г. п. Копысь Аршанскага раёна, дзе правёў нараду па пытаннях развіцця малых населеных пунктаў Аршанскага і Шклоўскага раёнаў. У рамках візіту Прэзідэнт пазнаёміўся з работай Цэнтра народнай творчасці і рамёстваў у Копысі, наведаў ганчарныя майстэрні і засяродзіў увагу не толькі на адраджэнні і развіцці народных промыслаў, але і праблеме выхаду Цэнтра на самаакупнасць.

МЕРАПРЫЕМСТВЫ,

якія не ўвайшлі ў папярэдні выпуск

28–29 кастрычніка ў Латвіі прайшоў VI Міжнародны фестываль народнай культуры «Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе», у якім прынялі ўдзел беларускія творчыя калектывы з Латвіі, Літвы, Эстоніі і Беларусі. На фестываль завітала прадстаўнічая дэлегацыя з Міёрскага раёна, які мае з Цэнтрам беларускай культуры ў Даўгаўпілсе пагадненне аб супрацоўніцтве. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Аляксандр Тронькін прыняў удзел у канферэнцыі «Культурны мост: Латвія, Літва, Эстонія, Беларусь», на якой размова ішла пра развіццё культурных сувязей, міжнацыянальны і міжкультурны дыялог. Ён уручыў кіраўніку Цэнтра беларускай культуры Жанне Раманоўскай Ганаровую грамату аддзела за ўнёсак у культурнае супрацоўніцтва. Салісткі самадзейнай народнай эстраднай студыі РДК «Зарніцы» Дар’я Шук і Дзіяна Малаўка ўдзельнічалі ў заключным гала-канцэрце і былі адзначаны дыпломамі. У міжнародным мерапрыемстве прымалі ўдзел і браслаўчане. Кіраўнік народнага клуба рамеснікаў «Ля возера» Наталля Парахневіч і майстар па пляценні паясоў Людміла Рулевіч прэзентавалі выставу лепшых работ членаў аматарскага аб’яднання і правялі майстар-клас па вырабе павука-абярэга з саломы. Полацкі рэгіён прадставіла дэлегацыя педагогаў. Метадыст Полацкага раённага Цэнтра дзяцей і моладзі Галіна Фаміна прэзентавала праект па адраджэнні беларускіх нацыянальных традыцый і абрадаў «Ад вытокаў – у будучыню». Экспанаваліся работы педагогаў і навучэнцаў Полацкага Цэнтра дзяцей і моладзі – сувенірная прадукцыя ручной працы з бяросты, саломы, льну, а таксама лялькі. У заключным канцэрце ўдзельнічаў узорны фальклорны калектыў «Знічка» Палатоўскай ДС-СШ Полацкага раёна.

матывах твора Гофмана «Шчаўкунчык і Мышыны кароль». Рэжысёр – Кацярына Дыбаль. Харэограф – Аляксандр Верам'ёў.

ХАРЭАГРАФІЯ

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь харэаграфічны ансамбль «Зорька» Цэнтра культуры «Віцебск» заняў першыя месцы ў намінацыях «Народна-сцэнічны танец» і «Эстрадны танец» на XII Рэспубліканскім конкурсе харэаграфічнага мастацтва, які праходзіў з **30 кастрычніка па 1 лістапада** ў Нацыянальным адукацыйна-аздараўленчым дзіцячым цэнтры «Зубронак».

23–27 лістапада ў Віцебску адбыўся XXIX Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі. Арганізатар – Цэнтр культуры «Віцебск». Заснавальнікі – Міністэрства культуры Беларусі, Віцебскі аблвыканкам і Віцебскі гарвыканкам, Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь. На міжнародны конкурс, які праходзіў у рамках фестывалю, свае работы прывезлі 32 калектывы з 9 краін. Міжнароднае журы ўзначальваў вядомы балетмайстар, прафесар Пекінскай акадэміі танца Сяо Сухуа. Выступленні праходзілі на сцэне Канцэртнай залы «Віцебск». Гран-пры прысуджаны салісту Цэнтральнага ансамбля песні і танца арміі КНР Юйчэну Яо. Першую прэмію атрымаў сумесны праект кафедры харэаграфіі Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў і польскага харэографа Мацея Кузьміньскага «After before».

18–25 лістапада ў Віцебскай вобласці, як і ў цэлым па рэспубліцы, праходзіў Тыдзень прафсаюзнай культуры. Маштабнай рэспубліканскай акцыяй завяршыўся культурны марафон Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў рамках Года культуры. Ва ўсіх раённых цэнтрах і буйных гарадах прайшлі гала-канцэрты творчых калектываў і выканаўцаў пад дэвізам «Народныя таленты табе, Беларусь», выступленні фіналістаў конкурсу «Новыя імёны Беларусі», узнагароджанне актывістаў прафсаюзнага руху, кіраўнікоў прадпрыемстваў і клубных устаноў.

20 лістапада адзначаўся Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу. Ва ўстановах культуры вобласці адбыліся ўрачыстыя мерапрыемствы, былі арганізаваны яркія, насычаныя канцэртныя праграмы ў гонар працаўнікоў сяла.

Беларускі фонд культуры сумесна з «Краязнаўчай газетай» і Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь распачаў новы праект «Мой род – мая радзіма», накіраваны на папулярызацыю краязнаўчай літаратуры. Першая прэзентацыя праекта, якая адбылася **24 лістапада** ў Музеі гісторыі музычнай і тэатральнай культуры, прайшла з удзелам прадстаўнікоў Пастаўскага раёна. Падчас прэзентацыі адбыліся паказ відэафільма «Спадчына» Пастаўскай тэлестудыі і фотавыстава аб Пастаўскім раёне фатографа Антона Чалея, выстава краязнаўчых кніг, выдадзеных краязнаўцамі Пастаўшчыны. Суправаджала мерапрыемства выступленне музычнай групы заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь фальклорнага ансамбля «Паазер'е» з Пастаў. Прысутнічалі вядомыя гісторыкі і дзеячы культуры, прадстаўнікі СМІ, сябры Пастаўскага зямляцтва.

29 лістапада ў Браславе прайшлі Свята-Панцелеямонаўскія духоўна-адукацыйныя чытанні. Прадстаўнікі духавенства, раённай улады, устаноў адукацыі і культуры абмеркавалі праблемы духоўна-маральнага здароўя моладзі і сацыяльныя праблемы грамадства.

Па выніках рэспубліканскага конкурсу «Горад культуры ў Год

культуры» пераможцам у намінацыі «Лепшы горад абласнога падпарадкавання» быў прызнаны горад Наваполацк.

У Гарадку **ў лістападзе** было праведзена пасяджэнне прэзідыума абласнога Савета ветэранаў – работнікаў культуры. Члены прэзідыума на чале са старшынёй Г. І. Клёсавай наведалі ўстановы культуры райцэнтра, абмеркавалі сённяшні стан культуры Гарадоччыны.

Перспектывы супрацоўніцтва паміж Віцебшчынай і Ізраілем, у тым ліку і ў культурнай сферы, былі абмеркаваны **5 снежня** ў Віцебскім аблвыканкаме ў ходзе рабочага візіту ў Віцебск Часовага Паверанага ў справах Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Вольгі Слов. Прадстаўнік ізраільскай дыпмісіі наведала шэраг устаноў культуры абласнога цэнтра, пабывала ў яўрэйскай абшчыне, сустрэлася з дырэкцыяй Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

6 снежня ў Глыбокім прайшлі II рэгіянальныя Калядныя чытанні «1917–2017. Праваслаўе ў гісторыі і культуры Беларусі: вынікі стагоддзя» пад старшынствам архіепіскапа Полацкага і Глыбоцкага Феадосія. У работе прынялі ўдзел прадстаўнікі царкоўных структур, органаў дзяржаўнай улады, дзеячы навукі, культуры, адукацыі і грамадскія дзеячы Беларусі. Абмеркаванне пытанняў праходзіла на пасяджэннях пяці тэматычных секцый. У пленарным пасяджэнні прынялі ўдзел старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. У. Цярэнцьеў і Уладыка Феадосій, які выступіў з дакладам «1917–2017 – урокі стагоддзя». Напрыканцы на сцэне гарадскога Дома культуры выступілі актэт балалаечнікаў «Витебские виртуозы» Віцебскай абласной філармоніі, народны камерны хор Глыбоцкага ГДК і мінскі аўтар-выканаўца А. Длускі.

8 снежня ў Шаркаўшчынскім райвыканкаме падпісаны пратакол намераў аб супрацоўніцтве паміж Зарасайскім раённым самакіраваннем Літоўскай Рэспублікі і Шаркаўшчынскім раёнам. Пачатковым этапам заключанага пагаднення стаў першы адкрыты міжрэгіянальны фестываль ансамблевай музыкі «Вясёлка сугуччаў», які прайшоў у гэты дзень у

вядомы дырыжор І. Айхгорн з нямецкага горада Вецлара.

Узорны ансамбль фольк-стыль «Званіца» Бешанковіцкай дзіцячай школы мастацтваў адзначыў 15-гадовы юбілей. Рэпертуар складаюць у асноўным беларускія народныя песні і аўтарскія кампазіцыі стваральніка і мастацкага кіраўніка Наталлі Бондар-Галавач. З нагоды юбілею на сцэне раённага Цэнтра культуры была прадстаўлена новая праграма «Стрэлы Перуновы».

2–13 снежня ў Віцебску прайшоў XXVIII Міжнародны музычны фестываль імя І. І. Салярцінскага. У гэтым годзе форум быў прысвечаны 110-годдзю з дня нараджэння выдатнага кампазітара Дзмітрыя Шастаковіча. У прэстыжнай культурнай падзеі ўзялі ўдзел музыканты, музыказнаўцы з Беларусі, Расіі, Ізраіля, Латвіі. Ганаровымі гасцямі фестывалю сталі сын І. І. Салярцінскага Дзмітрый Салярцінскі і ўнук кампазітара Дзмітрый Шастаковіч. У філіяле Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва «Арт-прастора» была прэзентавана фотавыстава Д. Шастаковіча «Боковое зрение». У абласной філармоніі экспанавалася выстава плакатаў студэнтаў кафедры дызайну ВДТУ пад назвай «Гульня ў класіку».

9 снежня ў Цэнтры культуры «Віцебск» прайшлі рэгіянальныя адборачныя туры Віцебскай вобласці на XXVI Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні і XV Міжнародны дзіцячы музычны конкурс, якія стануць галоўнымі падзеямі XXVI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ў 2017 годзе.

10–11 снежня адбыўся IV музычны фестываль «Гучаць старадаўнія арганы Пастаўшчыны». Месцамі яго правядзення сталі касцёлы Святога Антонія Падуанскага ў Паставах і Святога Іаана Хрысціцеля ў Камаях. Удзельнічалі мінскі арганіст Віктар Кісцень, салісты Белдзяржфілармоніі Тамара Рэмез і Канстанцін Шараў, выкладчыца Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Вольга Падгайская, мастацкі кіраўнік музычнай капэлы «Санорус» Аляксандр Хумала.

17 снежня ў Віцебскай абласной філармоніі адбылася прэм’ера музычнага спектакля «Зімняя казка, або Сон у навагоднюю ноч» па

заключным канцэрце прынялі ўдзел выхаванцы і педагогі ДШМ № 3 г. Барані (лаўрэаты і дыпламанты ў намінацыі «Інструментальная музыка»), а таксама ўзорны хор «Cantare», малодшы хор «Кантарики», навучэнцы эстраднага аддзялення ДШМ № 1 г. Оршы (лаўрэаты і дыпламанты конкурсу вакальна-харавога мастацтва). У пачатку лістапада Оршу наведаў Клод Рэвольт (Францыя) – прэзідэнт міжнароднай федэрацыі фестываляў «Еврооркестрия», член журы XXII Міжнароднага конкурсу дзіцячай і юнацкай творчасці «Роза ветров-2016» у Маскве.

49-ы Міжнародны конкурс піяністаў, які прайшоў у Чэхіі **9–11 лістапада**, прынёс поспех навучэнцы Наваполацкай ДШМ № 1 Ангеліне Пірог, якая стала лаўрэатам III ступені ва ўзроставай катэгорыі 10–11 гадоў.

18 лістапада на сцэне Палаца культуры КСК ААТ «Полацк-Шкловалакно» адбыліся ўрачыстасці з нагоды 70-годдзя музыканта, педагога, дырыжора Пятра Казлова, 50-годдзю яго творчай дзейнасці і 45-годдзю створанага ім народнага аркестра народных інструментаў Полацкай дзіцячай школы мастацтваў.

19–20 лістапада на сцэне Палаца культуры ААТ «Нафтан» адбыўся адкрыты рэспубліканскі конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні «Халі-Хало–2016», у якім удзельнічалі лепшыя вакалісты з 16 гарадоў Беларусі і Расіі. Уладальніцай Гран-пры стала 15-гадовая выхаванка магілёўскай эстраднай студыі «Радуга» Ірына Круглік.

27 лістапада канцэртам польскага арганіста Гедыміна Груббы завяршыўся XXI Міжнародны фестываль арганнай музыкі «Званы Сафіі». У канцэртнай зале Полацкага Сафійскага сабора на працягу месяца выступілі беларуская музычная капэла «Санорус», віртуозны арганіст з Германіі Маціас Якаб, салістка канцэртнай залы Сафійскага сабора Ксенія Пагарэлая і іншыя выканаўцы.

Віцебскі народны гарадскі маладзёжны хор адсвяткаваў сваё 25-годдзе ўрачыстым канцэртам у Віцебскім музычным каледжы імя І. І. Салярцінскага. Павіншаваць калектыў, які стварыў Віталь Аляксандравіч Рауза і якім кіруе яго сын Аляксандр Рауза, прыехаў

Шаркаўшчынскім раённым Цэнтры культуры і аб'яднаў юных музыкантаў з Літвы, Латвіі і Беларусі. Удзел у мерапрыемстве прынялі лепшыя ансамблі Шаркаўшчынскай, Браслаўскай, Міёрскай, Глыбоцкай, Пастаўскай дзіцячых школ мастацтваў і іх філіялаў, а таксама дзіцячыя калектывы Зарасайскай мастацкай школы і Шпогскай музычнай і мастацкай школы (Латвія).

Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў адзначыў 45-годдзе з моманту заснавання. Урачыстасці прайшлі ў Віцебскай абласной філармоніі **16 снежня**. На свяце многім работнікам каледжа былі ўручаны Падзякі старшынь аблвыканкама і гарвыканкама, Ганаровыя граматы адміністрацыі Першамайскага раёна Віцебска, узнагароды Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, Фонду міру, ГА «Белая Русь» і інш. Дырэктар каледжа Ірына Абдулаева ўдастоена нагруднага знака Міністэрства культуры «За ўклад у развіццё культуры Беларусі». У вялікім святочным канцэрце выступілі навучэнцы і выпускнікі каледжа, педагогі.

26 снежня ў Віцебску была праведзена агульнагарадская акцыя «Зажжем елку вместе!» У святочным шэсці ўдзельнічалі каля 500 пар Дзядоў Марозаў са Снягуркамі і мноства казачных персанажаў. Па добрай традыцыі адбылося ўшанаванне таленавітай моладзі, якая праславіла Віцебшчыну на розных конкурсах, алімпіядах, чэмпіянатах. Перад гледачамі выступілі лепшыя творчыя калектывы і выканаўцы горада.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

У лістападзе ў Віцебску прайшлі традыцыйныя Дні культуры Латвіі, прымеркаваныя да Дня абвяшчэння Латвійскай Рэспублікі. Пытанням супрацоўніцтва ў сферы адукацыі была прысвечана сустрэча консула Латвіі ў Віцебску Угіса Скуі з выкладчыкамі і студэнтамі ВДУ імя П. М. Машэрава. Семінар па турызме з удзелам тураператараў Віцебшчыны і рэгіёнаў Латвіі быў праведзены ў консульстве Латвійскай

Рэспублікі ў Віцебску. Творчая праграма свята пачалася з адкрыцця ў Арт-цэнтры Марка Шагала выставы жывапісных твораў мастачкі з Рыгі Дайгі Крузе. У рамках Дзён культуры Віцебск наведалі прадстаўнікі Даўгаўпілскай краявой думы і члены беларускай творчай суполкі «Уздым», у Канцэртнай зале «Віцебск» адкрылася выстава работ мастака з Даўгаўпілса Валдыса Буша і адбыўся канцэрт рок-групы «ELPA». У Віцебскім мастацкім музеі экспанаваліся выстава работ мастакоў Юрмалы і калекцыя Рыжскага музея дэкаратыўнага мастацтва і дызайну.

Дэлегацыя Чашніцкага раёна была запрошана на святкаванне Дня незалежнасці Латвіі ў горад-пабрацім Віляку, дзе прыняла ўдзел у Дні самакіравання Вілякскага краю і свяце пажылых людзей «Дзень сеньёраў». На гэтых мерапрыемствах з поспехам выступіў ансамбль народнай песні «Каліна» Новалукомльскага Палаца культуры.

З мэтай умацавання ўзаемавыгадных культурных сувязяў Оршу наведала група работнікаў культуры з украінскага горада Чаркасы. У складзе дэлегацыі – прадстаўнікі ўпраўлення культуры і турызму Чаркаскага гарвыканкама, Нацыянальнага саюза майстроў народнага мастацтва Украіны, дзіцячых музычнай і мастацкай школ, бібліятэк. Госці з горада-пабраціма наведалі шэраг культурных аб’ектаў г. Оршы і г. п. Копысь, абмеркавалі перспектывы далейшага супрацоўніцтва ў культурнай сферы і магчымасці пашырэння прамых кантактаў паміж культурнымі ўстановамі Оршы і Чаркасаў.

Аршанскі раён наведала дэлегацыя з Латвіі на чале з першым намеснікам старшыні Талсінскага краю Нормундсам Тропіньшам. На прыёме ў Аршанскім райвыканкаме былі разгледжаны асноўныя сферы ўзаемадзеяння – эканоміка, культура, спорт, турызм. Госці наведалі вядучыя прадпрыемствы, узорныя культурныя і спартыўныя аб’екты Аршаншчыны.

Напрыканцы **лістапада** ўзорны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Камарыкі» Палаца культуры ААТ «Нафтан» удзельнічаў ва ўрачыстасцях, прысвечаных 70-гадоваму юбілею ансамбля песні і танца

прысутных феерычным відовішчам.

13 лістапада ў Беларускім тэатры «Лялька» адбылася прэзентацыя дыска «Вясельныя песні і найгрышы вёскі Лявонпаль і яе наваколляў у запісах Сяргея Панізніка 1968–1969 гадоў». У імпрэзе ўзялі ўдзел музыкант Сяргей Доўгушаў, пісьменніца-казачніца Алена Масла і этна-гурт «Варган» з Полацка.

Артыст Беларускага тэатра «Лялька» Сяргей Талкач узнагароджаны дыпломам лаўрэата IV Рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» ў намінацыі «Лепшая мужчынская роля ў спектаклі для дзяцей і юнацтва» за выкананне ролі Клоўна Піка ў спектаклі «Горад клоўна Піка».

Спектакль «Гэта ўсё яна» па п’есе маладога беларускага аўтара Андрэя Іванова ў пастаноўцы Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа прызнаны «Лепшым спектаклем» VII Міжнароднага фестывалю камерных тэатраў і спектакляў малых формаў «АртОкраина», які праходзіў **1–10 снежня** ў расійскім Санкт-Пецярбургу. Рэжысёр-пастаноўшчык Аляксандр Марчанка, у ролях Таццяна Ліхачова, Раман Салаўёў, Арцём Герак.

9 снежня ў тэатральнай гасцёўні Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа адбылася прэм’ера спектакля «Матылёк… Матылёк…» паводле п’есы італьянскага драматурга А. Нікалаі. Рэжысёр Валерый Анісенка. У галоўнай ролі заслужаная артыстка Беларусі Тамара Скварцова.

17 снежня ў тэатры імя Я. Коласа адбыўся першы паказ музычнай казкі для маленькіх гледачоў «Прыгоды Дзюймовачкі». Рэжысёр-пастаноўшчык Міхась Краснабаеў. Сцэнаграфія Святланы Макаранкі. У ролі Дзюймовачкі – маладая актрыса Ульяна Ацясава.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

28 кастрычніка – 1 лістапада ў Маскве праходзіў XXII Міжнародны конкурс дзіцячай і юнацкай творчасці «Роза ветров-2016». У

краязнаўчым музеі адбылося адкрыццё выставы «Тэатр у люстэрку часу». Экспазіцыю склалі прадметы тэатральнага рэквізіту, кнігі, дакументы і ўнікальныя фотаздымкі коласаўцаў. У гэты дзень у тэатральнай гасцёўні тэатра адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Беларускі нацыянальны тэатр: традыцыі, пошук, эксперымент», удзельнікамі якой сталі вядомыя мастацтвазнаўцы з Віцебска і Мінска, тэатральныя дзеячы, прадстаўнікі грамадскасці, навучэнцы. **19 лістапада** ў тэатральнай гасцёўні прайшла прэзентацыя новай кнігі віцебскага краязнаўцы Аркадзя Падліпскага «Национальный академический драматический театр имени Якуба Коласа: страницы прошлого и настоящего». **21 лістапада** адбылася ўрачыстая вечарына на сцэне коласаўскага тэатра. «Тэатр прызямліўся ў Віцебску» – так называлася святочная пастаноўка, у якой рэжысёр Міхась Краснабаеў з'яднаў мінулае тэатра з яго сённяшнім днём. У афіцыйнай частцы гучалі віншаванні, уручаліся ганаровыя граматы і падзякі. Першы намеснік міністра культуры Беларусі Ірына Дрыга зачытала прывітальны адрас ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, уручыла Ганаровую грамату Міністэрства культуры заслужанай артыстцы Беларусі Тамары Скварцовай і Падзяку міністра маладому акцёру Раману Салаўёву. Народныя артысты Беларусі Святлана Акружная і Тадэуш Кокштыс былі ўдастоены спецыяльных прызоў, зацверджаных коласаўскім тэатрам.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад **24 лістапада** 2016 года № 427 вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Віктар Дашкевіч узнагароджаны ганаровым званнем «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь».

Значнай падзеяй у тэатральным жыцці стала святкаванне 70-гадовага юбілею мастацкага кіраўніка Беларускага тэатра «Лялька», заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Віктара Клімчука. **12 лістапада** ў «Ляльцы» юбіляра віншавалі прадстаўнікі абласной улады, галоўны рэжысёр Гродзенскага абласнога тэатра лялек Алег Жугжда, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі Юрый Пахомаў, акцёры-коласаўцы. Творчы калектыў «Лялькі» парадаваў юбіляра і

«Дзеці Плоцка», у польскім горадзе-пабраціме Наваполацка.

З рабочым візітам ў бібліятэцы замежнай літаратуры цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Віцебска пабываў Паверанны ў справах ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Роберт Райлі. Аддзел інфармацыі, адукацыі і культуры Пасольства ЗША ў Беларусі супрацоўнічае з бібліятэкай з 2005 года. Асноўныя накірункі далейшага супрацоўніцтва былі абмеркаваны з удзелам начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама Наталляй Шыянок і дырэктарам ЦБС Галінай Данілавай.

Узорны ансамбль бальнага танца «Фартуна» Палаца культуры КСК ААТ «Полацк-Шкловалакно» **ў снежні** знаходзіўся ў гастрольнай паездцы па гарадах Германіі. У праграме: канцэртныя выступленні ансамбля, майстар-класы вядомых заходнееўрапейскіх балетмайстраў.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

4 лістапада ў Палацы культуры КСК ААТ «Полацк-Шкловалакно» адбыўся вечар-ушанаванне лаўрэатаў гарадской творчай намінацыі «Прызнанне». Сярод узнагароджаных і ветэраны мастацкай самадзейнасці, і кіраўнікі творчых калектываў, і вядомыя на Полаччыне і ў рэспубліцы выканаўцы.

Тыдзень памяці славутага пісьменніка, драматурга, перакладчыка Уладзіміра Караткевіча праводзіўся **ў лістападзе** на яго радзіме ў Оршы. Супрацоўнікі Аршанскага музея У. С. Караткевіча правялі ўрокі памяці для школьнікаў, літаратурныя вандроўкі «Я нарадзіўся на Дняпры…», пазнавальную літаратурна-краязнаўчую вечарыну «Адметныя мясціны Віцебшчыны», літаратурна-музычную вечарыну аб'яднання паэтаў Аршаншчыны «Дняпроўскія галасы» пад назвай «Між Дняпром і крыкам жураўліным...». На літаратурнай гадзіне ў дзіцячай гарадской бібліятэцы

імя У. С.Караткевіча прысутнічалі вучні СШ № 8 і выхаванцы краязнаўчага гуртка Цэнтра дзяцей і моладзі. У цэнтральнай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна была праведзена літаратурна-музычная гасцёўня «Варта ў крылы паверыць свае». 26 лістапада, у дзень нараджэння слыннага земляка, ля яго помніка ў дзіцячым парку «Казачная краіна» прайшлі літаратурныя чытанні «І не знікаць паэтам вечна».

30 лістапада сябры народнага літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне», які дзейнічае пры Полацкім раённым Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур, урачыста адзначылі 90-годдзе старэйшай у рэспубліцы літаратурнай суполкі, якая з'яўляецца пераемніцай Полацкай філіі літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Юбілейная вечарына адбылася ў канферэнц-зале Полацкай цэнтральнай бібліятэкі імя Ф. Скарыны. Шматлікія прыхільнікі творчасці наддзвінцаў пазнаёміліся з выставай альманахаў, зборнікаў і аўтарскіх кніг членаў аб'яднання, паглядзелі відэакліп «Ад пачатку да сёння», які адлюстраваў гісторыю «Наддзвіння». Адбылося ўшанаванне лепшых творцаў, гучалі вершы, песні.

27 снежня ў Лёзненскім РЦК адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў II раённай творчай прэміі «Сунічка-2016». Былі адзначаны лепшыя работнікі культуры, асобныя выканаўцы і творчыя калектывы, у тым ліку і дзіцячыя, у 17 намінацыях. Спецыяльная прэмія за асабісты ўклад у развіццё культуры раёна была ўручана дырэктару Дома культуры аграгарадка Дабрамыслі Аляксею Агееву. У мерапрыемстве ўдзельнічала дэлегацыя з г. Рудня Смаленскай вобласці.

КЛУБНАЯ СПРАВА

2 лістапада ў выставачнай зале Дома рамёстваў і фальклору ў КАЦ «Гарадок» была прэзентавана выстава «Свята народнага касцюма». Кашулі, спадніцы, сукенкі, фартухі, лапці і інш. – традыцыйныя і стылізаваныя – зроблены паводле артэфактаў, знойдзеных выключна ў Гарадоцкім раёне.

З 17 лістапада да 16 снежня ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці працавала абласная выстава-конкурс народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Ручнік – як лёс». У выставачнай зале АМЦНТ былі прадстаўлены: калекцыя рэканструкцый ручнікоў, знойдзеных падчас этнаграфічных экспедыцый у раёнах Віцебшчыны; абразы (іконы); інсталяцыі, якія выяўляюць мясцовыя адметнасці выкарыстання ручнікоў у побыце і разнастайных абрадах; вышыванкі з узорамі рэгіянальных арнаментаў, якія былі зроблены да абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў сяла «Дажынкі-2016» у г. Сянно. Правядзенне абласной выставы-конкурсу народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Ручнік – як лёс» зарыентавана на даследаванне мясцовых традыцый народнай культуры, аднаўленне рамесных сакрэтаў і абрадавага ладу жыцця, а таксама абуджэнне крэатыўнага мыслення майстроў народнай творчасці.

КІНАМАСТАЦТВА

17 снежня ў Полацку прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Дню беларускага кіно. Адбыліся сустрэчы з рэжысёрам-пастаноўшчыкам Аленай Туравай, гісторыкам Сяргеем Тарасавым, праведзены круглы стол на тэму «Перспектывы беларускага кіно: прафесійнага і аматарскага» з удзелам першага намесніка міністра культуры Рэспублікі Беларусь Ірыны Дрыгі. У Палацы культуры КСК ААТ «Полацк-Шкловалакно» былі падведзены вынікі III Адкрытага конкурсу аматарскіх фільмаў імя Юрыя Тарыча «Я здымаю кіно». На конкурс былі дасланы работы 66 аўтараў з Беларусі, Расіі, Германіі, Грузіі, Латвіі, Малдовы і Казахстана. Пераможцам у намінацыях конкурсу былі ўручаны дыпломы і каштоўныя прызы.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа ўрачыста адзначыў сваё 90-годдзе. У Віцебску прайшоў шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да юбілею. **18 лістапада** ў абласным

жывапісных твораў мінскай мастачкі, ураджэнкі Віцебшчыны Марыі Ісаёнак.

Каля 40 жывапісных і графічных работ смаленскага мастака Рамана Выдрына былі прадстаўлены на яго персанальнай выставе «Пространства», якая экспанавалася ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. А. Грамыкі **ў лістападзе**.

30 лістапада ў Полацкай мастацкай галерэі адкрылася персанальная выстава «Пейзаж» віцебскага мастака Леаніда Мядзвецкага.

13 снежня ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. А. Грамыкі адкрылася выстава «Юныя таленты Дзеснагорска». У экспазіцыі – дыпломныя работы выпускнікоў Дзеснагорскай мастацкай школы Смаленскай вобласці.

У мастацкім салоне «Скарбонка» ДУК «Лепельскі Цэнтр рамёстваў» **у снежні** разгарнулася выстава работ члена Саюза мастакоў Беларусі Анатоля Ільінова «Лепельшчына ў сэрцы маім…», прымеркаваная да 80-гадовага юбілею вядомага віцебскага мастака.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

11 лістапада Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці прэзентаваў выставу «Народнае мастацтва Віцебшчыны» ў Смаленскім абласным цэнтры народнай творчасці. У экспазіцыю ўвайшлі праекты па развіцці народнай творчасці, рэалізаваныя за апошнія 5 гадоў. Сярод іх конкурсы па лозапляценні «Лазовы прут», па выцінанцы «Ажурныя мары», па мастацкім роспісе «Фарбы нябёсаў», па ткацтве «Палатняныя пераплёты», па вырабе традыцыйнай цацкі і лялькі «Забава-2015», па народным касцюме «Сцяжкі майстэрства», якія праходзілі ў рамках фестывалю «Славянскі базар у Віцебску», і абласныя святы-конкурсы па лапікавым шыцці «Здраўнёўская палітра», па вышыўцы «Ручнік – як лёс» і інш. У адкрыцці выставы прынялі ўдзел народны фальклорны калектыў «Кудзеліца» і майстры народнай творчасці з Дуброўна.

4 лістапада народны тэатр Браслаўскага раённага Цэнтра культуры парадаваў сваіх прыхільнікаў прэм’ерай камедыі «Вяселле» па п’есе М. Зошчанкі. Рэжысёр спектакля Яўген Набееў.

4 лістапада ў Глыбоцкім ГДК адбыўся канцэрт «Осенняя рапсодия» народнага камернага хору Глыбоцкага Дома культуры пад кіраўніцтвам Дар'і Волкавай.

10 лістапада народны клуб самадзейных мастакоў «Белый холст» Полацкага ГДК адзначыў 30-гадовы юбілей. У гарадскім Палацы культуры з гэтай нагоды была адкрыта юбілейная экспазіцыя «Цяпло душы». Добрыя словы гучалі ў адрас першага кіраўніка клуба Аліны Мацецкай і Ганаровага члена Саюза мастакоў Беларусі Віктара Любавіцкага, іншых удзельнікаў клуба. Музычныя віншаванні падрыхтавалі артысты ГДК Аня Лялюга і Галіна Ліфанава.

13 лістапада ў Бешанковіцкім раённым Цэнтры культуры адбыўся «Частушечный марафон», у якім спаборнічалі каманды Ульскага, Бачэйкаўскага сельскіх Дамоў культуры і Бешанковіцкага РЦК. Лепшай у выкананні народнага песеннага жанру прызнана каманда раённага Цэнтра культуры.

13 лістапада ў выставачнай зале Лёзненскага Дома рамёстваў адкрылася выстава майстрыхі Ірыны Левянковай з г. п. Лёзна «Волшебство моих рук» і быў праведзены майстар-клас па тэхніцы «пляценне з газетных трубачак».

16 лістапада 20-гадовы юбілей адзначыла шоў-група «Black Diamond» Полацкага гарадскога Палаца культуры юбілейным канцэртам на сцэне Палаца культуры КСК ААТ «Полацк-Шкловалакно».

17 лістапада ў Полацкім раённым Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур адкрылася выстава жаночых упрыгажэнняў «Бісерная саната». Майстры Беларусі (г. Віцебск, г. Наваполацк, г. Мінск, г. Брэст) і Расіі (г. Кіраў) прадставілі звыш 100 работ з бісеру. Ва ўстанове культуры экспанавалася таксама выстава «Сонца ў душы». Аўтар работ,

выкананых у тэхніцы аплікацыі саломкай, Вера Смолік з Полацкага раёна.

18 лістапада ў Глыбоцкім Доме рамёстваў пад назвай «Мінулае і сучаснае» адкрылася першая персанальная выстава маладога ганчара Арцёма Фаміна – метадыста раённага Дома рамёстваў. У экспазіцыі керамічныя вырабы і лепка з гліны.

20 лістапада ў Капцянскім СДК Віцебскага раёна адбылося свята лялькі ў рамках творчага праекта «Лялька», рэалізацыя якога праходзіла ў 2016 годзе. Культработнікі падрыхтавалі тэатралізаванае прадстаўленне, канцэрт «Лялечная карусель» з удзелам творчых калектываў СДК, кірмаш прысмакаў і выставу «Лялечны карагод», дзе былі прадстаўлены лялькі-абярэгі, колішнія і сучасныя лялькі з хатніх калекцый жыхароў аграгарадка. Была афармлена выстава малюнкаў, створаных выхаванцамі мясцовага дзіцячага садка.

23 лістапада ў Шаркаўшчынскім раённым Цэнтры рамёстваў адкрылася выстава мастацкіх работ шаркаўчаніна Віктара Крука пад назвай «Пад крыламі анёла».

24 лістапада ў Бешанковіцкім раённым Доме рамёстваў адкрылася выстава фондавых работ «З бабулінага куфэрка». У экспазіцыі прадстаўлены работы, сабраныя работнікамі Дома рамёстваў у ходзе этнаграфічных экспедыцый па раёне. Гэта ўзоры ткацтва, вышыўкі, прадметы побыту.

25 лістапада на базе Каўшэлеўскага дома фальклору Шаркаўшчынскага раёна ў пяты раз ладзіліся «Піліпаўскія вячоркі». Удзельнікі народнага фальклорнага гурта «Купалінка», створанага ў 1989 годзе, спявалі народныя і абрадавыя песні. Былі прадэманстраваны відэазапісы папярэдніх вячорак, вялася зацікаўленая размова пра захаванне і папулярызацыю мясцовага фальклору.

25 лістапада ў Міёрскім РДК адбыўся сольны канцэрт спевака-земляка Віталя Хаданёнка, які жыве і працуе ў г. Наваполацку. У праграме, падрыхтаванай мясцовым рэжысёрам Вольгай Борскай,

гісторыю музея».

26 снежня Полацкі краязнаўчы музей адзначыў 90-годдзе з дня адкрыцця першай экспазіцыі. Да гэтай даты старэйшы музей горада арганізаваў навукова-краязнаўчую канферэнцыю, адкрыў новы раздзел экспазіцыі. 28 снежня ў музеі адбылося ўрачыстае адкрыццё залы, прысвечанай ганаровым грамадзянам горада.

«Свята на крылах анёлаў» – пад такой назвай адкрылася калядная выстава ў полацкім Музеі беларускага кнігадрукавання. Аснову экспазіцыі склала асабістая калекцыя супрацоўніцы Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Людмілы Крапіўкі. Разам з фігуркамі анёлаў прадстаўлены паштоўкі, часопісы, кнігі адпаведнай тэматыкі: «Хрысціянская азбука», «Святое Пісанне для дзяцей» і інш.

Напрыканцы **снежня** ў Аршанскім этнаграфічным музеі «Млын» адкрылася выстава «З куфара – да святак». У экспазіцыі – тканыя і вышываныя вырабы, выкананыя ўручную нашымі продкамі.

МАСТАЦТВА

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 лістапада 2016 года № 427 вядомы віцебскі жывапісец Аляксандр Аляксандравіч Салаўёў удастоены ордэна Францыска Скарыны.

«Лицом к лицу» – пад такой назвай у Віцебскім мастацкім музеі ў пачатку **лістапада** адкрылася выстава віцебскіх мастакоў, выкладчыкаў дзіцячай мастацкай школы Віцебска Леаніда Мядзвецкага і Уладзіміра Бузікава.

Навучэнка 2-га класа Наваполацкай дзіцячай мастацкай школы імя І. Ф. Хруцкага Марыя Варанкова перамагла ў XI Рэспубліканскім адкрытым мастацкім конкурсе, які праходзіў **у лістападзе** ў Мінску.

У Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка **ў лістападзе** адкрылася выстава

музей, дзякуючы рэалізацыі мясцовай ініцыятывы «Адраджэнне паркава-сядзібных збудаванняў» у рамках праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Амаль 400 розных старажытных прадметаў з'яўляюцца ўпрыгожаннем выставачнай залы Сітцаўскага Дома культуры.

22 лістапада споўнілася 30 гадоў з дня адкрыцця для наведвальнікаў Шумілінскага гісторыка-краязнаўчага музея. У юбілейнай праграме: фотавыстава «Нам – 30», экспазіцыя «30 шедевров Шумилинского музея», музейныя ўрокі для школьнікаў «В гостях у Музея Музеевича», святочнае мерапрыемства «Музей збірае сяброў».

8 снежня ў віцебскім Музеі Марка Шагала прайшла прэзентацыя аўдыёгіда для людзей з парушэннямі зроку ў рамках сумеснага беларуска-польскага праекта.

Рэспубліканскі семінар кіраўнікоў музеяў устаноў адукацыі прайшоў **у снежні** ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі. Спецыялісты з розных гарадоў Беларусі абмеркавалі ролю экспазіцый навучальных устаноў у патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення, падзяліліся вопытам работы.

21 снежня ў Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова адбылося пасяджэнне круглага стала «Асоба ў гісторыі, праблемы ўспрымання», прысвечанага 125-годдзю з дня нараджэння М. П. Шмырова. У мерапрыемстве ўдзельнічалі навуковыя супрацоўнікі музеяў вобласці, гісторыкі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, студэнты гістарычнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава. 23 снежня ў музычным каледжы імя І. І. Салярцінскага прайшла ўрачыстая вечарына з нагоды юбілею легендарнага партызанскага камандзіра і 50-годдзя заснавання музея імя М. П. Шмырова. Завяршыліся ўрачыстыя мерапрыемствы традыцыйнай акцыяй «Партызанская ёлка».

24 снежня Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей адзначыў 40-годдзе з дня свайго адкрыцця. Да юбілею была арганізавана выстава лепшых музейных калекцый і новых паступленняў «40 прыступак у

прагучалі акадэмічныя і эстрадныя песні.

29 лістапада ў Бешанковіцкім раённым Цэнтры культуры адбыўся конкурс прафесійнага майстэрства работнікаў клубных устаноў раёна, у якім удзельнічалі 5 мастацкіх кіраўнікоў сельскіх Дамоў культуры. Званне «Лепшы клубны работнік-2016» было прысуджана Наталлі Сцепанец з Ульскага СДК.

30 лістапада ў Талачынскім раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці адбыўся кінавечар, на якім быў прэзентаваны фільм «Неизвестная Толочинщина» – новая творчая работа мясцовага краязнаўцы і кіраўніка народнай кінастудыі «Летапіс» Цэнтра культуры Дзмітрыя Іўчанкі.

У Аршанскім гарадскім Цэнтры культуры «Победа» **ў лістападзе** экспанавалася выстава члена народнага клуба мастакоў «Рэнесанс» Святланы Дзянісавай і фатографа-аматара Святланы Марэцкай.

Выстава аматарскіх фотаработ віцяблянкі Ліліі Забаўленкі экспанавалася ў Суражскім Доме культуры Віцебскага раёна **ў лістападзе**.

Мазалаўскі СДК правёў **у лістападзе** чарговы Дзень адчыненых дзвярэй, на які завіталі жыхары аграгарадка і прадстаўнікі турыстычнай кампаніі «Дэльта Трэвэл» з г. Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці. У межах творчай справаздачы аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах прайшлі выстава вырабаў удзельнікаў дзіцячага гуртка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Чароўны куфэрак», майстар-клас кіраўніка гуртка Вольгі Ганчаровай па вырабе святочных сувеніраў, міні-канцэрт жаночага клуба «Залаты ўзрост», дэгустацыя страў нацыянальнай кухні «Мазалаўскія прысмакі», адкрытыя заняткі бэбі-клуба «Фантазёры» і аматарскага аб'яднання «Сустрэчы ля каміна», экскурсія па этнаграфічнай выставе «З гарышчаў бабуль і дзядуль» і інш. **У снежні** ў Доме культуры пачала дзейнічаць выстава пад назвай «Мая Радзіма». У экспазіцыі фотаработы замежных студэнтаў віцебскіх ВНУ – членаў клуба інтэрнацыянальнага сяброўства «Згода», які створаны пры Мазалаўскім СДК.

2 снежня ў Талачынскім раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці адбыўся вечар «Несмолкаемые аплодисменты», прысвечаны памяці заўчасна пайшоўшых з жыцця работнікаў культуры і таленавітых людзей Талачыншчыны Валерыя Іванавіча Галубкова, Мікалая Барысавіча і Людмілы Іванаўны Ерашовых, Валерыя Фёдаравіча Зайцава, Аляксандра Іванавіча Кавалёва. У праграме – песні, рамансы, дэманстрацыя фота- і відэаматэрыялаў, успаміны сучаснікаў.

3 снежня ў Лёзненскім раённым Доме рамёстваў адбылося пасяджэнне клуба «Крыніцы» пад назвай «Посиделки с мастером». Удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з выставай «Традыцыі і сучаснасць», сустрэліся з майстрамі па мастацкай вышыўцы Таццянай Лубскай і Тамарай Дзядковай, наведалі творчыя заняткі «Шьем саше для трав».

11 снежня ў рамках творчага праекта «Вечар разам» у Пастаўскім раённым Доме культуры адбыўся канцэрт хору ветэранаў, які дзейнічае пры РДК 36 гадоў і ўзначальвае яго таленавіты дырыжор Павел Пятровіч Рагіня.

Вечар-сустрэча «На ўсё жыццё адна мясціна» ў Полацкім раённым Цэнтры культуры быў прысвечаны ўшанаванню ветэранаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці АПК і сабраў лепшых прадстаўнікоў з розных куткоў Полаччыны.

25 снежня ў Шаркаўшчынскім раённым Цэнтры культуры адбыўся тэатралізаваны канцэрт «Валёнкі», які падрыхтавалі работнікі культуры і самадзейныя артысты. Рэжысёр – Аксана Міронава.

25 снежня ў Доме культуры аграгарадка Веляшковічы Лёзненскага раёна прайшоў песенны праект «Мы помнім…». Работнікі ДК падрыхтавалі песні з рэпертуару вядомых выканаўцаў, якія пайшлі з жыцця, але іх творчасць помняць і любяць слухачы розных пакаленняў. Ішла размова пра творчы шлях А. Міронава, В. Талкуновай, М. Крысталінскай, Я. Мартынава, В. Цоя і інш., гучалі іх самыя вядомыя кампазіцыі ў выкананні самадзейных артыстаў.

6 лістапада ў канцэртнай зале Сафійскага сабора адбыўся канцэрт, прысвечаны памяці былога дырэктара Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Мікалая Ільніцкага, які зрабіў вялікі ўклад у развіццё культуры горада. У выкананні салісткі канцэртнай залы Ксеніі Пагарэлай і арганісткі Валерыі Шчупак прагучалі творы музычнай класікі.

У Полацкім краязнаўчым музеі на пачатку **лістапада** была арганізавана вечарына памяці выдатнага палачаніна, пісьменніка, франтавіка, Ганаровага грамадзяніна Полацка Алеся Ануфрыевіча Савіцкага. Успамінамі пра А. Савіцкага падзяліліся паэт, публіцыст, кіраўнік радыёстанцыі «Беларусь» Навум Гальпяровіч, журналіст, галоўны рэдактар часопіса «Гаспадыня» Зіновій Прыгодзіч і палачанка Ніна Азернікава, сяброўка дзяцінства пісьменніка.

16 лістапада ў Аршанскім музеі У. С. Караткевіча адкрылася перасоўная выстава «Традыцыі і культура Японіі» Пасольства Японіі ў Рэспубліцы Беларусь.

У сталіцы Кыргызстана Бішкеку прайшоў XI Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў-удзельніц СНД. У складзе дэлегацыі Беларусі ў рабоце форуму прымала ўдзел дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Тамара Джумантаева. Вялікі інтарэс выклікаў яе даклад «Рэалізацыя праекта музеефікацыі комплексу насценнага жывапісу Спаса-Праабражэнскага храма».

Выстава «Загадкі фалерыстыкі» дзейнічала **ў лістападзе** ў Міёрскім раённым гісторыка-этнаграфічным музеі. Дзве вітрыны аб’ядналі значкі розных гадоў, большасць з якіх – з калекцыі пісьменніка-земляка Сяргея Панізніка.

На працягу **лістапада** ў Расонскім музеі баявой садружнасці праходзілі мерапрыемствы, прысвечаныя вядомаму флотаводцу Іларыёну Павалішыну. У праграме: гістарычны альманах, прысвечаны жыццю і дзейнасці віцэ-адмірала; адкрыццё музейнай экспазіцыі.

У вёсцы Сітцы Докшыцкага раёна адкрыўся гісторыка-культурны

Удзельнікі семінара падвялі вынікі 2016 года і вызначылі асноўныя напрамкі дзейнасці бібліятэк у Год навукі. Бібліятэкары цэнтральнай і Чашніцкай гарадской бібліятэк падзяліліся вопытам работы па правядзенні сацыякультурных акцый да Года культуры «Бібліязмярканне» і «Мы – за чытанне».

ДУК «Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Да Міжнароднага дня адмовы ад курэння ў чытальнай зале раённай бібліятэкі адбылася гадзіна здароўя «Скажем сигаретам «СТОП!», удзельнікамі якой былі вучні 8 класа Шаркаўшчынскай СШ № 2 і педыятр раённай паліклінікі Т. А. Прыстаўка.

У канцы **лістапада** ў дзіцячай бібліятэцы прайшло мерапрыемства, якое прысвячалася прэзентацыі макета будучай кнігі ўдзельніцы народнага літаратурна-музычнага аб'яднання «Світанак» Людмілы Ардынскай пад назвай «Белы бусел».

ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

2 снежня ў чытальнай зале раённай бібліятэкі прайшоў урок духоўнасці «Вера ў сэрцы маім» да Дня інвалідаў. На мерапрыемства быў запрошаны іерэй Вадзім Яско.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

У Віцебскім музеі гісторыі прыватнага калекцыяніравання **ў лістападзе** адкрылася выстава «Гісторыя гуказапісу». У экспазіцыі фанографы, грамафоны, патэфоны канца XIX – пачатку XX стагоддзяў з калекцыі мінчаніна Ігара Барысевіча.

У Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова адбылася сустрэча з віцебскім архітэктарам, былым начальнікам упраўлення па будаўніцтве і архітэктуры Віцебскага аблвыканкама Віктарам Ягадніцкім з нагоды яго 80-гадовага юбілею.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

12 лістапада ў Полацкім раённым Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і прызёраў III адкрытага конкурсу лапікавага шыцця «Полацк-квілт-2016», у якім прынялі ўдзел 104 майстры з Беларусі, Расіі, Германіі, Латвіі і Літвы. У экспазіцыю, якая адкрылася напрыканцы кастрычніка, увайшлі 108 работ, створаных, у асноўным, беларускімі майстрамі. Журы, якое ўзначальваў вядучы беларускі мадэльер-дызайнер Аляксандр Варламаў, прысудзіла першае месца мінчанцы Святлане Шолкавай у намінацыі «Кругосветное путешествие». Калектыўная работа навапалачанак Наталлі Калантай, Наталлі Панкрацьевай і Ірыны Сяргеевай – трыпціх «По великому шелковому пути» – удастоена першага месца ў намінацыі «Попутный ветер». 8-гадовая палачанка Аліна Ханевіч перамагла ў намінацыі «Мой разноцветный мир». Прыз народнага клуба «Рошва» атрымаў клуб «Домашняя мастерская» з расійскага горада Кастрама.

17–18 лістапада ў гарадскім Палацы культуры «Орша» адбыўся Міжнародны конкурс патрыятычнай песні «Сердцем причастны», які з'яўляецца фестывалем-эстафетай аднайменнага конкурсу ў г. Холм Наўгародскай вобласці (Расія). У Оршы сустрэліся выканаўцы, дуэты і творчыя калектывы з пяці краін: Беларусі, Расіі, Латвіі, Казахстана і Германіі. Усе ўдзельнікі фестывалю – лаўрэаты конкурсу патрыятычнай песні «Сердцем причастны» і іншых міжнародных творчых праектаў.

19 лістапада ў Аршанскім ГЦК «Победа» адбыўся заключны гала-канцэрт раённага мнагажанравага фестывалю народнай творчасці «Серебряный век», у якім прынялі ўдзел звыш 100 чалавек. Усім удзельнікам фестывалю былі ўручаны дыпломы за ўдзел і дыпломы ў розных намінацыях.

25–26 лістапада заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь фальклорны ансамбль «Паазер'е» Пастаўскай дзіцячай школы мастацтваў прыняў удзел у VI Міжнародным фестывалі народнай музыкі «Дуэты гарманістаў» у горадзе-пабраціме Пастаў – Малетаі (Літва).

26 лістапада ў Гарадоцкім ГДК прайшоў VII абласны агляд-

конкурс харэаграфічных калектываў «Прыдзвінскія карункі», прысвечаны заслужанаму дзеячу культуры Беларусі Івану Арцёмавічу Серыкаву. У абласным аглядзе-конкурсе прынялі ўдзел звыш 700 танцораў з 29 творчых калектываў з розных рэгіёнаў Віцебшчыны, сярод якіх – заслужаныя аматарскія калектывы Рэспублікі Беларусь – «Зорька» і «Лявоніха» з Віцебска, калектывы з найменнем «узорны» і «народны» – «Прыдзвінскія россыпы» (г. Наваполацк), «Каханачка» (Талачынскі раён), ансамбль «На ростанях» (г. Віцебск), «Яблынька» (г. Гарадок) і іншыя, а таксама госці з г. Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці – народны вакальны ансамбль «Традиция» і ўзорны харэаграфічны калектыў «Жемчужина». Абласное журы ўзначаліў мастацкі кіраўнік і балетмайстар ансамбля танца, песні і музыкі «Талака» Віцебскай абласной філармоніі Мікалай Падаляк. Па выніках конкурсу Гран-пры быў прысуджаны двум калектывам – узорнаму вакальна-харэаграфічнаму ансамблю «Перапёлачка» віцебскай гімназіі № 3 імя А. С. Пушкіна (сярод дзіцячых калектываў) і народнай студыі сучаснага танца Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў пад кіраўніцтвам Ірыны Бухавецкай (сярод дарослых калектываў).

26–27 лістапада ў цэнтральнай сядзібе Бярэзінскага біясфернага запаведніка прайшоў фестываль «Міфы на балоце», у межах якога адбылося святкаванне Дня нараджэння традыцыйнага персанажа запаведніка – Балотніка, а таксама адкрыццё першай у Беларусі міфалагічнай сцежкі. У праграме: дзённыя і начныя экскурсіі, выставы, майстар-класы, народныя гулянні і міфалагічныя анімацыйныя праграмы. На свята з'ехаліся госці з усёй Беларусі і краін бліжняга замежжа.

У лістападзе ў Маскве праходзіў VIII Міжнародны тэлевізійны фестываль-конкурс «Созвездие талантов-2016», у якім удзельнічалі творчыя калектывы Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў. Ансамбль гарманістаў быў удастоены дыплома I ступені, аркестр баянаў – дыплома II ступені, фальклорны ансамбль з кампазіцыяй «Фантазія на беларускія тэмы» стаў лаўрэатам фестывалю-конкурсу.

У канцы **лістапада** ў літоўскім горадзе Шакяй праходзіў

ДУК «Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

17 лістапада Пастаўская цэнтральная раённая бібліятэка правяла прэзентацыю кнігі мясцовага пісьменніка, географа, краязнаўцы, настаўніка Пастаўскай раённай гімназіі Ігара Пракаповіча «Стары Двор» з відэадэманстрацыяй слайдаў. Прэзентацыя праведзена з непасрэдным удзелам аўтара.

14 снежня ў Пастаўскай ЦРБ адбылася творчая сустрэча «Мая калыска – Мядзельшчына» з паэтам Аляксандрам Генадзьевічам Быкавым, які жыве і працуе ў Мядзельскім раёне.

18 снежня ў Варапаеўскай гарпасялковай бібліятэцы аматары паэзіі сустрэліся ў літаратурнай гасцёўні «Струменіцца Максімава крынічка» (клуб паэзіі «Брыганціна»), прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча.

20 снежня Пастаўская раённая бібліятэка правяла літаратурна-музычную вечарыну «Светлы след будзе вечна жывым…» да юбілею М. Багдановіча

ДУК «Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У дзіцячай бібліятэцы **ў лістападзе** была праведзена гульня-разважанне «Пристрастия, уносящие жизнь» да Міжнароднага дня адмовы ад курэння, **у снежні** для старшакласнікаў арганізавалі медыцынскі інфарм-кур'ер «Вирусный "Терминатор" – СПИД».

ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Супрацоўнікі бібліятэкі-філіяла № 17 Чырвонай Раніцы арганізавалі для жыхароў вёскі дзень памяці продкаў «Восеньскія Дзяды», прысвечаны народным традыцыям святкавання Дзмітрыеўскай бацькоўскай суботы. А **ў снежні** правялі фальклорнае свята «Повязь часоў – беларускі ручнік».

27 снежня адбыўся тэматычны семінар бібліятэчных работнікаў на тэму «Бібліятэка – новыя арыенціры дзейнасці. Плануем на 2017 год».

Надзеі Атопкінай у рамках рэалізацыі праекта «Адкрый у сябе талент». Лістападаўская сустрэча ўдзельнікаў клуба «Бажэна» была выніковай у гэтым годзе і мела назву «Восеньскі вернісаж». Прафілактыцы тытунёвай залежнасці была прысвечана сустрэча- роздум «У палоне шкодных звычак».

ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

3 лістапада ў Саланіцкай бібліятэцы-філіяле № 46 адбылася сустрэча з чэмпіёнам Паралімпійскіх гульняў-2016 у Рыо-дэ-Жанейра Андрэем Праневічам. Сустрэча прайшла ў добразычлівай, сардэчнай атмасферы. Андрэй Праневіч адказаў на шматлікія пытанні чытачоў бібліятэкі, падзяліўся сваімі планамі на будучыню.

3 снежня ў бібліятэцы імя Я. Купалы адбылося пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні «Под сенью духовности». З Мінска прыехалі ўдзельнікі клуба аматараў мастацкага слова «КЛУмБа», які дзейнічае пры Фундаментальнай бібліятэцы БДУ. У актавай зале сабраліся прадстаўнікі літаратурных аб'яднанняў Полацка «Наддзвінне», «Полоцкая ветвь», «Литературный ковчег», аматары паэтычнага слова.

ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

19 лістапада ў Какоўчынскай сельскай бібліятэцы прайшло пасяджэнне музычнай гасцёўні «Хвала рукам, что пахнут хлебом» да Дня работнікаў сельскай гаспадаркі. У Краснасельскай сельскай бібліятэцы праведзена літаратурна-музычная кампазіцыя «Зямлю можна зрабіць раем, калі рукі прыкласці».

Да 125-гадовага юбілею М. Багдановіча **ў снежні** былі праведзены: тэматычная вечарына «І застаўся ты ў нашых душах» (Багушэўская гарпасялковая бібліятэка); літаратурна-музычнае падарожжа «Край мой родны» (ЦРБ); літаратурна-музычная гасцёўня «І зорка гарыць, і не вяне вянок» (Машканская СБ).

Міжнародны фестываль-конкурс самадзейных цыркавых калектываў «Агні цырка». Добра выступілі і вярнуліся з узнагародамі рознай вартасці аршанцы – выхаванцы Алены Жаўненкі, кіраўніка ўзорнай цыркавой студыі «Арэна» і цыркавога калектыву «Феерыя».

27 лістапада ў зале Глыбоцкага гарадскога Дома культуры адбыўся XXI раённы конкурс юных талентаў «Вясёлыя галасы».

30 лістапада ў аршанскім ГЦК «Победа» прайшоў III міжрэгіянальны фестываль народнай творчасці ветэранаў «Песня збірае сяброў», у якім удзельнічалі 8 калектываў з Аршанскага, Бешанковіцкага, Віцебскага, Дубровенскага, Лёзненскага, Сенненскага і Талачынскага раёнаў. Кожны калектыў адрозніваўся па-свойму, усе атрымалі дыпломы ўдзельнікаў фестывалю.

2 снежня прагучаў заключны акорд 5-га творчага дабрачыннага праекта Полацкага раёна «З верай, надзеяй, любоўю…», прымеркаваны да Міжнароднага дня інвалідаў. У Палацы культуры КСК ААТ «Полацк-Шкловалакно» была арганізавана выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі, прайшоў гала-канцэрт, адбылося ўзнагароджанне ўдзельнікаў юбілейнай выставы і гала-канцэрта. Ганаровымі гасцямі юбілейнага праекта сталі залаты прызёр Паралімпіяды-2016 у Рыо-дэ-Жанейра фехтавальшчык Андрэй Праневіч і зорка беларускай эстрады, Пасол добрай волі Іскуі Абалян.

5 снежня ў абласной філармоніі прайшло традыцыйнае штогадовае свята-конкурс людзей з абмежаванымі магчымасцямі, прамеркаванае да Дня інвалідаў Рэспублікі Беларусь. У ім узялі ўдзел асобныя выканаўцы, а таксама творчыя калектывы і аматарскія аб'яднанні сацыяльных устаноў з усіх рэгіёнаў Віцебшчыны. Журы на чале з начальнікам аддзела культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Галінай Баркевіч прысудзіла Гран-пры прадстаўніку віцебскага прадпрыемства «Галант» Беларускага таварыства глухіх Леаніду Гарадзецкаму за жэставую песню «Ідэальны свет».

16 снежня ў Гарадоцкім ГДК адбылося свята народных рамёстваў «Майстры і майстэрства». Галоўнымі героямі свята сталі ўдзельнікі клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў «Вытокі», якія ў чарговы раз з 1985 года пацвердзілі званне «Народны самадзейны калектыў». У мерапрыемстве прыняў удзел галоўны спецыяліст Міністэрства культуры Беларусі І. І. Галабурда.

Традыцыйны фестываль інвалідаў «Зорка надзеі» ў 11-ы раз адбыўся ў Лепелі. Прадстаўнікі Віцебска і многіх раёнаў вобласці прадэманстравалі сваё майстэрства у танцах, эстрадных і народных спевах, паэзіі, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

У межах міжнароднага фестывалю-форуму дзяцей і моладзі «Мелодыі сяброў» у Наваполацк завіталі госці з Рэспублікі Татарстан. Прадстаўнікоў брацкага народа сустракалі ў СШ № 5 канцэртам, у якім выступілі гаспадары школы – ансамбль песні і музыкі «Сузор'е» і аркестр «Слабадскія музыкі». Свае нумары паказалі лепшыя вакальныя, харэаграфічныя і музычныя дзіцячыя калектывы культурнага цэнтра «Сайдаш» г. Казані. Затым беларусы і расіяне абмяняліся вопытам у рэчышчы народных традыцый.

20 снежня ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адкрылася абласная выстава-конкурс батлеек, калядных і навагодніх цацак і сувеніраў «Калядная зорка». У выставачнай зале АМЦНТ прадстаўлены батлеечныя і «верцепныя» канструкцыі, лялькі і дэкарацыі для паказу батлеечных спектакляў, навагоднія і калядныя цацкі і сувеніры, вырабленыя ў сучасных і традыцыйных тэхніках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Таксама падчас работы выставы была ўнікальная магчымасць убачыць як традыцыйныя «батлеечныя» прадстаўленні, так і спектаклі «сучаснай батлейкі» ў выкананні аматарскіх лялечных тэатраў Лёзненскага, Чашніцкага, Глыбоцкага, Шумілінскага, Гарадоцкага, Докшыцкага, Пастаўскага раёнаў Віцебскай вобласці. Тэатралізаванае каляднае прадстаўленне, якое арганізавалі спецыялісты Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці, таксама прыйшлося даспадобы юным гледачам.

навукова-практычная канферэнцыя «Праваслаўная царква і бібліятэка: аспекты супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння». У ёй прынялі ўдзел работнікі сельскіх і школьных бібліятэк раёна, благачынны Докшыцкай акругі протаіерэй Г. Мялешка.

ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

24 лістапада ў Дубровенскай ЦРБ была праведзена бібліяноч «Булгаковский переулок»сумесна з установамі культуры райцэнтра.

22 снежня ў цэнтральнай раённай бібліятэцы быў арганізаваны святочны «агеньчык» для ветэранаў аддзела культуры пад назвай «Зимней праздничной порой».

ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У лістападзе дзіцячая бібліятэка правяла наступныя мерапрыемствы: лялечны спектакль «Утёнок Дорофей», літаратурна-кулінарную гадзіну «Сладкая история», гульню-падарожжа «По дорогам сказок», гутарку-абмеркаванне «Алкоголю – нет!», гульнёвую праграму «Дружат дети всей земли».

ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

26 лістапада ў раённай бібліятэцы адкрылася літаратурная кавярня «Пад абажурам», якая ў будучым плануе збіраць творчых людзей – аматараў паэзіі, музыкі, мастацтва; арганізоўваць сустрэчы з цікавымі людзьмі; літаратурныя вечарыны, прысвечаныя юбілеям пісьменнікаў і паэтаў. На першую сустрэчу пад назвай «Каляровы свет яго вершаў…» прыйшлі прыхільнікі творчасці мясцовага паэта Пятра Даговіча, які прэзентаваў свой першы зборнік «Каляровы свет».

ДУК «Міёрская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У лістападзе ў Міёрскай цэнтральнай бібліятэцы адбылося адкрыццё выставы традыцыйнай вышыўкі «Праз рукі і сэрца» міярчанкі

Умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы цэнтраў спрыяла набыццё камп'ютараў, мультымедыйнага цэнтра, ноўтбука і МФА, а таксама камплектаў мэблі.

12 і 26 лістапада на базе Мазалаўскай СБ прайшлі адукацыйныя заняткі па курсе «Компьютер для жизни и бизнеса».

19 лістапада і 27 лістапада на базе Бабініцкай СБ прайшлі заняткі па курсе «Я – начинающий предприниматель» і «Компьютер для жизни и бизнеса».

30 лістапада ў цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся літаратурна-паэтычны вечар «Паэт святла, красы і кахання», прысвечаны творчасці і жыццёваму шляху Максіма Багдановіча, для чытачоў сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту.

ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк»

16 лістапада ў чытальнай зале Гарадоцкай раённай бібліятэкі адбылася чарговая сустрэча ў клубе па інтарэсах «Сверстник». Для ўдзельнікаў прайшоў урок-перасцярога «Куренье – смерть, а табак – яд».

24 лістапада ў аддзеле дзіцячай і юнацкай кнігі Гарадоцкай ЦРБ для ўдзельнікаў клуба па інтарэсах «Ключ» было праведзена краязнаўчае падарожжа «Чтоб жила культура предков».

ДУК «Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

10 лістапада ў цэнтральнай бібліятэцы праведзена гадзіна здароўя да Сусветнага дня моладзі «Молодёжь за здоровый образ жизни».

18 лістапада прайшло пасяджэнне «круглага стала» да Міжнароднага дня адмовы ад курэння «Поговорим о главном» у Сітцаўскай сельскай бібліятэцы.

20 лістапада адбыўся ўрок духоўнасці «Коснись сердца моего, Господи» ў Валкалацкай сельскай бібліятэцы.

14 снежня ў раённай дзіцячай бібліятэцы была праведзена

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

Манастырская бібліятэка аршанскага Свята-Богаяўленскага Куцеінскага мужчынскага манастыра перамагла ў намінацыі «Гісторыя праваслаўя роднага краю» Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – цэнтр духоўнай асветы і выхавання». Бібліятэкар Галіна Юркевіч была запрошана ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі, дзе прайшло ўзнагароджанне пераможцаў.

ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

7 лістапада ў рамках новага бібліятэчнага праекта «Літаратурныя ўрокі для школьнікаў: новы фармат» для вучняў 8-х класаў гімназіі № 7 г. Віцебска быў праведзены літаратурны ўрок «Зорка Венера ўзышла над зямлёю...», прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння беларускага паэта Максіма Багдановіча.

10 лістапада ў бібліятэцы адбылася чарговая лекцыя ў рамках бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». На лекцыі выступілі навуковы супрацоўнік Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Уладзімір Андрэйчанка, кандыдаты гістарычных навук Дзяніс Юрчак і Анатоль Дулаў, удзельнікі клуба гістарычнай рэканструкцыі «Vargentorn».

16 лістапада ў сектары замежнай літаратуры адбылася чарговая сустрэча ўдзельнікаў клуба англійскай мовы «Английский язык по средам». Членаў клуба аб'ядноўвае жаданне ўдасканальваць навыкі размоўнай англійскай мовы і цікавае правядзенне вольнага часу.

19 лістапада ў сектары замежнай літаратуры прайшлі «Паўночныя чытанні» скандынаўскай літаратуры ў рамках праекта «Тыдзень бібліятэк Паўночных краін». Гэты міжнародны праект, у якім удзельнічаюць бібліятэкі Даніі, Швецыі, Нарвегіі, Ісландыі і Фінляндыі, спрыяе знаёмству чытачоў з творамі скандынаўскіх аўтараў.

24 лістапада ў бібліятэцы адбылася II Міжнародная навукова-

практычная канферэнцыя «Віцебскі край», прысвечаная 385-годдзю выхаду ў свет «Буквара» Спірыдона Собаля. Арганізатарамі канферэнцыі выступілі Віцебская абласная бібліятэка, Віцебскі абласны краязнаўчы музей і Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт. Для ўдзелу ў канферэнцыі было пададзена больш за 60 заявак ад краязнаўцаў, гісторыкаў, супрацоўнікаў музеяў, бібліятэк, вышэйшых навучальных устаноў з Беларусі, Расіі, Латвіі. Каля 50 выступоўцаў прынялі ўдзел у рабоце наступных секцый: «Гістарычнае краязнаўства», «Літаратурнае краязнаўства і мастацкая культура», «Культурна-асветныя ўстановы ў сістэме сучаснага краязнаўства», «Рэлігійнае жыццё: гісторыя і сучаснасць». Шырокая тэматыка дакладаў, прадстаўленых на секцыях, закранала разнастайныя пытанні гісторыі Беларусі, літаратуразнаўства, краязнаўства, гісторыі архітэктуры, гісторыі кнігадрукавання. Галоўнай тэмай канферэнцыі стала 385-годдзе выдання «Буквара» Спірыдона Собаля, які з'яўляецца першым букваром на тэрыторыі Беларусі. Увазе ўдзельнікаў канферэнцыі была прадстаўлена факсімільная копія «Буквара», выдадзеная выдавецтвам Беларускага Экзархата. З дакладам «Кутеинская Лавра – духовно-просветительский центр в XVII веке» выступіла бібліятэкар бібліятэкі Свята-Богаяўленскага Куцеінскага мужчынскага манастыра Галіна Юркевіч. На выставе «А напачатку было Слова...» былі прадстаўлены кнігі па гісторыі кнігадрукавання, гісторыі бібліятэк Беларусі, разнастайныя буквары з фонду Віцебскай абласной бібліятэкі. Па матэрыялах канферэнцыі будзе выдадзены зборнік.

24 лістапада ў бібліятэцы праведзены чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма: «Традыцыі гарадскога самакіравання ў Віцебску». На лекцыі выступілі кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Навукова-тэхналагічнага парка БНТУ «Політэхнік» Максім Макараў і кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела археаграфіі і крыніцазнаўства Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксандр Доўнар.

24 лістапада ў аддзеле эканамічнай, тэхнічнай і

Мерапрыемства праходзіла ў рамках праекта «Бібліятэка без межаў» для наведвальнікаў Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

20 снежня ў цэнтральнай бібліятэцы адбылася нарада «Дзень прафесійных зносін» для бібліятэчных работнікаў сістэмы.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Верхнядзвінскага раёна»

1 лістапада супрацоўнікі аддзела бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай раённай бібліятэкі арганізавалі для работнікаў ДУК «Верхнядзвінская ЦБС» семінар «Досуг в библиотеке: организация, реклама и проведение мероприятий». У праграму яго ўваходзілі кансультацыі: «Библиотека – центр организации досуга. Реклама в библиотеке»; «Проведение массовых мероприятий в библиотеке»; «Планирование работы на 2017 год». Бібліятэкары філіялаў прынялі ўдзел у квесце-гульні «Верхнедвинск. Город старый. Город новый».

15 снежня ў чытальнай зале Верхнядзвінскай ЦРБ прайшла інтэлектуальная гульня для старшакласнікаў «Снежная сова», прысвечаная навагоднім святам.

22 снежня на чарговае пасяджэнне клуба цікавых сустрэч «Сучаснік» (ЦРБ) быў запрошаны мастак Валерый Шчасны, які пазнаёміў прысутных са сваёй творчасцю.

ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Тэрыторыі Бабініцкага і Мазалаўскага сельсаветаў увайшлі ў пілотныя тэрыторыі па рэалізацыі праекта «Пашырэнне эканамічных магчымасцяў у сельскай Беларусі». Заснавальнікам праекта з'яўляецца фонд «Новая Еўразія» пры падтрымцы Еўрапейскага Саюза і Фонду «Еўразія». У рамках праекта рэалізуецца сумесная ініцыятыва «Адукацыя і адраджэнне гісторыка-эканамічнай спадчыны для ўстойлівага развіцця Мазалаўскага і Бабініцкага сельскіх Саветаў». На базе бібліятэк адкрыты цэнтры дадатковай адукацыі «Камп’ютар для жыцця і бізнесу».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка»

У лістападзе ЦБ імя У. Маякоўскага стала пляцоўкай для такіх значных для горада падзей, як VIII конкурс чытальнікаў беларускіх твораў і выстава ««Венценосная семья. Путь любви». Конкурс чытальнікаў «Я – беларус, я ганаруся, што маю гэтае імя…» адбыўся 18 лістапада і быў прысвечаны творчасці Ніла Гілевіча. Больш за сто школьнікаў 7–11-х класаў Наваполацка, Полацка і Полацкага раёна прадэманстравалі мастацтва дэкламацыі. Арганізатарам конкурсу юных знаўцаў беларускага слова стала Наваполацкая гарадская арганізацыя РГА «Белая Русь».

15 лістапада ў ЦБ імя У. Маякоўскага прайшла чарговая сустрэча ў рамках праекта «Дотянуться до звёзд Новополоцка». У гэты раз госцем бібліятэкі стаў Мікалай Розум – яркая асоба, пераможца конкурсу «Студэнт года Віцебшчыны-2015», лаўрэат спецыяльнай прэміі аблвыканкама «Чалавек года Віцебшчыны-2015» (намінацыя «Моладзь»), студэнт-выпускнік інжынерна-тэхналагічнага факультэта ПДУ.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна»

21–27 лістапада ў цэнтральнай раённай бібліятэцы праходзіў Тыдзень прававых ведаў «Моладзь і закон».

27 лістапада ў цэнтральнай раённай бібліятэцы адбылося пасяджэнне клуба «Сустрэча», у межах якога праведзена музычна-паэтычная гадзіна «Как я выжил, будем знать только мы с тобой», прысвечаная жыццю і творчасці Канстанціна Сіманава.

У дзіцячай бібліятэцы **ў лістападзе** праведзена пасяджэнне клуба «Юныя сябры прыроды». Для ўдзельнікаў была арганізавана экскурсія ў Міжраённую Браслаўскую лабараторыю радыяцыйна-экалагічнага маніторынгу.

13 снежня ў цэнтральнай бібліятэцы былі праведзены бібліятэчныя пасядзелкі «Чараўніцтва святочных задум» з элементамі гульнявой праграмы, з прымяненнем электронных сродкаў.

сельскагаспадарчай літаратуры прайшло пасяджэнне абласнога клуба пчаляроў «Залаты вулей». Для ўдзельнікаў клуба былі падрыхтаваны выстава-прагляд «Мёд. Пчолы. Пчальнік», а таксама агляд новых кніг па пчалярстве.

29 лістапада ў аддзеле перыядычных выданняў у рамках бібліятэчнага праекта «Разам!» адбыўся літаратурна-музычны вечар «Творчасць, якая сагравае сэрцы», прымеркаваны да Міжнароднага дня інвалідаў.

4 снежня ў аддзеле літаратуры па мастацтве прайшла сустрэча з філолагам, мастацтвазнаўцам, старшынёй Санкт-Пецярбургскага таварыства Д. Шастаковіча Дзмітрыем Іванавічам Салярцінскім. У рамках сустрэчы адбыўся прагляд кінафільма А. Сакурава «Альтовая саната», прысвечанага жыццю і творчасці кампазітара Д. Шастаковіча.

6 снежня ў бібліятэцы ў рамках гарадской праграмы ўрачыстасцей, прысвечаных памяці святога князя Аляксандра Неўскага, адбылося адкрыццё фотавыставы «Храмоздатели Руси». Мэта выставы – расказаць пра пабудаваныя і адроджаныя храмы на тэрыторыі Расіі і Беларусі, пра людзей, якія ўнеслі свой уклад ва ўзнаўленне святынь.

8 снежня ў бібліятэцы адбыліся чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма: «Альгерд – князь віцебскі». Кандыдаты гістарычных навук Дзяніс Юрчак і Анатоль Дулаў расказалі слухачам курсаў пра становішча на землях ВКЛ у XIII–XIV стст. і непасрэдна пра вялікага князя Альгерда і яго дачыненне да Віцебска.

11 снежня ў сектары замежнай літаратуры працавала тэатральная студыя «Калядныя казкі», у якой актыўны ўдзел прынялі навучэнцы гімназіі № 2 г. Віцебска пад кіраўніцтвам настаўніка замежнай мовы Т. Н. Сініцы.

14 снежня ў бібліятэцы прайшла літаратурная вечарына «Зорка Венера ўзышла над зямлёю...», прысвечаная 125-годдзю беларускага паэта

М. Багдановіча, у рамках якой адбылося ўзнагароджанне лаўрэатаў абласнога конкурсу па стварэнні відэаролікаў «Чытаем Багдановіча разам», прымеркаванага да Года культуры ў Рэспубліцы Беларусь.

15 снежня ў бібліятэцы ў рамках цыкла «Краязнаўчыя сустрэчы» адбылася сустрэча з краязнаўцам, кандыдатам гістарычных навук Мікалаем Піваварам.

18 снежня ў нямецкай чытальнай зале адбылося юбілейнае пасяджэнне клуба «Hier spricht man Deutsch».

20 снежня ў бібліятэцы адбылося адкрыццё выставы «Калядныя ўзоры». На выставе прадстаўлены вязаныя вырабы з беларускім арнаментам членаў Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Святланы Лягковай і Тамары Волах, а таксама навагоднія ўпрыгожанні з калекцыі музея «Гісторыя Заронаўскага краю».

21 снежня ў бібліятэцы ў рамках цыкла «Краязнаўчыя сустрэчы» адбылася сустрэча з журналістам, фотамастаком Міхаілам Шмерлінгам. 7 снежня Міхаіл Маркавіч адзначыў 70-годдзе. Павіншаваць знакамітага фотамастака ў бібліятэку прыйшлі пісьменнікі, мастакі, краязнаўцы, журналісты, супрацоўнікі музеяў.

27 снежня ў бібліятэцы адбылося тэатралізаванае адкрыццё выставы дзіцячага малюнка «И тихо говорю я с Ангелом своим...». На выставе прадстаўлены 22 работы навучэнцаў студыі выяўленчай творчасці «Сузор'е» ДУА «Віцебскі гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі» (выкладчык Святлана Хмыльніна). У мерапрыемстве прыняў удзел настаяцель Свята-Праабражэнскага храма, кіраўнік аддзела рэлігійнай адукацыі Віцебскай епархіі протаіерэй Андрэй Смольскі.

28 снежня супрацоўнікамі нямецкай чытальнай залы была праведзена гульнятэка і экскурсія для навучэнцаў СШ № 9, якія вывучаюць нямецкую мову.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»

На «Лялечны баль» запрасіла сваіх чытачоў ЦГБ імя М. Горкага **9 лістапада**. Не зусім звычайная сустрэча з лялькамі, зробленымі сваімі рукамі, адбылася, дзякуючы навучэнцам УА «Віцебскі дзяржаўны індустрыяльна-тэхналагічны каледж», якія прадставілі на выставу свае работы. Пра тое, як ствараюцца ўнікальныя лялькі і іх адзенне, расказаў культарганізатар каледжа У. А. Гарэцкі. Выстава лялек была дапоўнена дэфіле «Тэатра моды», які прадэманстраваў некалькі прыгожых калекцый.

16 лістапада ў межах Дзён культуры Латвіі ў Віцебску ў ЦГБ імя М. Горкага адбылася сустрэча чытачоў з прадстаўнікамі беларускага культурна-асветніцкага таварыства «Уздым» з Даўгаўпілса і членамі Віцебскага аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Пра дзейнасць культурнага таварыства цікава расказала яго старшыня Людміла Сінякова. Потым Людміла Сінякова, Вольга Паўловіч, намеснік старшыні таварыства і член праўлення Таццяна Дзянісава прадставілі творчасць паэтаў, якія з'яўляюцца сябрамі таварыства: Анастасіі Сазанковай, Станіслава Валадзько, Паўла Плотнікава, Ірыны Страздонік-Плячко, Зянона Бурага і іншых. У сваю чаргу са сваімі паэтычнымі творамі выступілі віцебскія паэты Мікалай Намеснікаў і Уладзімір Крайнеў.

«Тут кожнаму адчынены дзверы» – свята кнігі, прысвечанае 65-гадоваму юбілею, адбылося ў бібліятэцы імя М. Лынькова **24 лістапада**. Павіншаваць бібліятэку з юбілеем прыйшлі чытачы, вучні і настаўнікі СШ № 43 і СШ № 16 г. Віцебска, калегі з бібліятэк горада. Канцэртную праграму ўдзельнікам свята падарылі выкладчыкі і калектыў ансамбля «Лашкары» віцебскай СШ № 33.

У снежні 30-гадовы юбілей адзначыла юнацкая бібліятэка імя П. Броўкі. На ўрачыстай вечарыне былі ўшанаваны не толькі бібліятэкары, але і самыя адданыя чытачы. Прагучалі віншаванні ад калектыву СШ № 25, з канцэртам выступілі выхаванцы школы мастацтваў № 5.